Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі
“Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Францыска Скарыны”

**У. А. БОБРЫК, Н. П. ЦІМАШЭНКА**

# СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ МОВА: СІНТАКСІС

Тэставыя заданні

для студэнтаў
спецыяльнасці 1-21 05 01 «Беларуская філалогія» (па напрамках)

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Гомель
ГДУ імя Ф.Скарыны
2015

УДК 811.161.3’367 (079.1)
ББК 81.411.3-22я73
Б 727

Рэцэнзенты:
кандыдат філалагічных навук А. М. Ермакова;
кандыдат філалагічных навук І. А. Бароўская

Рэкамендавана да друку навукова-метадычным саветам
установы адукацыі “Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Францыска Скарыны”

Б 727 **Бобрык, У. А.**
Сучасная беларуская мова: сінтаксіс : тэставыя заданні / У. А. Бобрык, Н. П. Цімашэнка ; М-ва адукацыі РБ, Гом. дзярж. ўн-т ім. Ф. Скарыны. – Гомель: ГДУ ім. Ф. Скарыны, 2015. – 44 с.
ISBN 978-985-439-974-4

Тэставыя заданні ахопліваюць асноўныя тэмы сінтаксісу простага сказа: “Словазлучэнне”, “Просты двухсастаўны сказ”, “Просты аднасастаўны сказ”, “Галоўныя члены сказа”, “Даданыя члены сказа”, “Просты ўскладнены сказ”.
Прызначаны для студэнтаў філалагічнага факультэта спецыяльнасці 1-21 05 01 “Беларуская філалогія” (па напрамках).

**УДК 811.161.3’367 (079.1)**
**ББК 81.411.3-22я73**

**ISBN 978-985-439-974-4**

© Бобрык У. А., Цімашэнка Н. П., 2015
© УА «Гомельскі дзяржаўны
ўніверсітэт імя Ф. Скарыны», 2015

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# ЗМЕСТ


| | |
|---|---|
| Уводзіны ………………………………………………………………. | 3 |
| Словазлучэнне ……………………………………………………… | 4 |
| Просты сказ. Агульная характарыстыка простага сказа …… | 9 |
| Дзейнік ………………………………………………………………… | 14 |
| Выказнік ……………………………………………………………….. | 19 |
| Даданыя члены сказа ……………………………………………… | 24 |
| Аднасастаўны сказ …………………………………………………. | 29 |
| Просты ўскладнены сказ …………………………………………... | 34 |
| Адказы ………………………………………………………………… | 40 |
| Літаратура ……………………………………………………………... | 42 |


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# УВОДЗІНЫ

Тэсціраванне – адна з форм самастойнай працы студэнта, абавязковы кампанент вучэбных планаў філалагічнага факультэта вышэйшай навучальнай установы. Мэта напісання тэставых заданняў – засвоіць і ўдасканаліць тэарэтычныя веды па пэўнай дысцыпліне, выявіць уменне выкарыстоўваць набытыя веды на практыцы.

Задачы вывучэння курса беларускай мовы для студэнтаў дзённай формы навучання спецыяльнасці 1-21 05 01 "Беларуская філалогія" (па напрамках) – дапамагчы студэнтам авалодаць нацыянальнай мовай беларускага народа, выпрацаваць маўленчыя навыкі, засвоіць асноўныя тэарэтычныя і практычныя пытанні па сінтаксісе, павысіць пісьменнасць і культуру мовы, развіць здольнасць самастойна даследаваць шматлікія моўныя з'явы.

У сувязі з гэтымі задачамі ў працэсе навучання беларускай мове студэнт-філолаг павінен засвоіць тэарэтычныя пытанні сінтаксісу як вучэння аб словазлучэннях і сказах, іх структуры і тыпах, навучыцца выкарыстоўваць атрыманыя веды для рашэння пэўнай лінгвістычнай задачы, класіфікаваць моўны матэрыял, аналізаваць словазлучэнні і сказы і г. д.

Тэставыя заданні прысвечаны аналізу сінтаксічнага ладу сучаснай беларускай мовы. Асноўная ўвага надаецца разгляду тыпаў словазлучэння, характарыстыцы сказа па ўсіх яго кваліфікацыйных прыметах: па мэце выказвання, па эмацыянальнай афарбоўцы, па колькасці граматычных частак, па характару прэдыкатыўнай асновы, па наяўнасці або адсутнасці даданых членаў сказа, па ступені паўнаты, неабходнай для дадзенай стуктуры сказа, па наяўнасці або адсутнасці кампанентаў, якія ўскладняюць сказ.

Перш чым выконваць працу, студэнт-філолаг павінен дэталёва пазнаёміцца з заданнямі, вывучыць адпаведную літаратуру. Толькі пасля гэтага ён можа прыступіць да выканання тэстаў.

Тэставыя заданні, прадстаўленыя ў некалькіх варыянтах, адзіныя для ўсіх студэнтаў.

Яны ахопліваюць асноўныя тэмы гэтага раздзела: "Словазлучэнне", "Просты двухсастаўны сказ", "Просты аднасастаўны сказ", "Галоўныя члены сказа", "Даданыя члены сказа", "Аднародныя члены сказа", "Адасобленыя члены сказа". Прызначаны для студэнтаў філалагічнага факультэта спецыяльнасці 1-21 05 01 "Беларуская філалогія" (па напрамках).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# СЛОВАЗЛУЧЭННЕ

## Варыянт 1

**1 Адзначце словазлучэнні, у якіх від сувязі – дапасаванне:**
1) пяты кіламетр;
2) яго кніга;
3) якісьці незнаёмец;
4) жаданне дапамагчы;
5) у бязвоблачным небе.

**2 Адзначце словазлучэнні, у якіх від сувязі – кіраванне:**
1) выкананы ўсімі;
2) тры газеты;
3) прачытаны дыктарам;
4) пяць балаў;
5) з яго пытаннем.

**3 Адзначце словазлучэнні, у якіх від сувязі – прымыканне:**
1) з’еўшы абед;
2) у іх хаце;
3) удвая мацней;
4) просьба дапамагчы;
5) жадаць перамогі.

**4 Адзначце спалучэнні слоў, якія не з’яўляюцца словазлучэннямі:**
1) на працягу стагоддзяў;
2) трыста сорак чатыры;
3) месяц за месяцам;
4) цяжкі экзамен;
5) жаданне паспець.

**5 Адзначце словазлучэнні з памылкамі ў кіраванні:**
1) ажаніцца на ёй;
2) паслаць па соль;
3) забегчы да яго;
4) падзякаваць бацькоў;
5) разумнейшы яе.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## Варыянт 2

**1 Адзначце словазлучэнні, у якіх від сувязі – дапасаванне:**
1) прыехаць вучыцца;
2) шчыры чалавек;
3) нешта цікавае;
4) убачыць сябра;
5) на гомельскіх вуліцах.

**2 Адзначце словазлучэнні, у якіх від сувязі – кіраванне:**
1) два сталы;
2) яго кніга;
3) ад гэтых поспехаў;
4) фарба для сцен;
5) намаляваны алоўкамі.

**3 Адзначце словазлучэнні, у якіх від сувязі – прымыканне:**
1) прыгатаваць абед;
2) сустрэцца з сябрамі;
3) вельмі прыгожы;
4) жаданне прачытаць;
5) белы снег.

**4 Адзначце спалучэнні слоў, якія не з'яўляюцца словазлучэннямі:**
1) на змену восені;
2) шчырая ўсмешка;
3) буду вучыцца;
4) надвор'е цёплае;
5) прыгожа спяваць.

**5 Адзначце словазлучэнні з памылкамі ў кіраванні:**
1) пайсці за грыбамі;
2) ажаніцца з удавой;
3) мацнейшы за брата;
4) пісаць на адрас;
5) загадчык кафедрай.

## Варыянт 3

**1 Адзначце словазлучэнні, у якіх від сувязі – дапасаванне:**
1) прыехаць позна;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

2) спазніцца на занятку;
3) разумны студэнт;
4) дапамагчы маці;
5) у сонечны дзень.

**2 Адзначце словазлучэнні, у якіх від сувязі – кіраванне:**
1) прыехаць улетку;
2) выканаць практыкаванне;
3) прачытаць даклад;
4) пяць сшыткаў;
5) рашэнне выехаць.

**3 Адзначце словазлучэнні, у якіх від сувязі – прымыканне:**
1) прыгатаваць вячэру;
2) прыемны пах;
3) кава па-турэцку;
4) просьба працаваць;
5) жыць у вёсцы.

**4 Адзначце спалучэнні слоў, якія не з'яўляюцца словазлучэннямі:**
1) амаль выканаў;
2) выклікаць адказваць;
3) дурань дурнем;
4) зялёны і блакітны;
5) самы прыгожы.

**5 Адзначце словазлучэнні з памылкамі ў кіраванні:**
1) хворы раматузам;
2) паслаць па дзяцей;
3) дом на пяць павярхаў;
4) падзякаваць сябрам;
5) прыгажэй яе.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## Варыянт 4

**1 Адзначце словазлучэнні, у якіх від сувязі – дапасаванне:**
1) кожны тыдзень;
2) даведацца пра прыезд;
3) выхаваная дачка;
4) у блакітным небе;
5) роўная дарога.

**2 Адзначце словазлучэнні, у якіх від сувязі – кіраванне:**
1) згублены білет;
2) два артыкулы;
3) прачытаць услых;
4) пяць студэнтаў;
5) прыехаць з вёскі.

**3 Адзначце словазлучэнні, у якіх від сувязі – прымыканне:**
1) сустрэць з цягніка;
2) магчымасць адпачыць;
3) удвая прыгажэй;
4) сядзець моўчкі;
5) зайсці да сяброўкі.

**4 Адзначце спалучэнні слоў, якія не з'яўляюцца словазлучэннямі:**
1) студэнты працуюць;
2) сорак восем;
3) цікавыя заняткі;
4) вочы, поўныя слёз;
5) накіраванне на працу.

**5 Адзначце словазлучэнні з памылкамі ў кіраванні:**
1) чытаць пра сябе;
2) паслаць па алей;
3) хварэць грыпам;
4) жартаваць над сябрам;
5) разумнейшы за яе.

## Варыянт 5

**1 Адзначце словазлучэнні, у якіх від сувязі – дапасаванне:**
1) сонечнае святло;
2) кніга брата;
3) цікавае знаёмства;
4) жаданне працаваць;
5) у дзедавай хаце.

**2 Адзначце словазлучэнні, у якіх від сувязі – кіраванне:**
1) кожны з нас;
2) дзве дзяўчынкі;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

3) падрыхтаваць загад;
4) сустрэча з сябрамі;
5) вельмі асцярожна.

**3 Адзначце словазлучэнні, у якіх від сувязі – прымыканне:**
1) апрануты па-спартыўнаму;
2) вельмі актыўны;
3) прыгожы твар;
4) просьба напісаць;
5) заехаць да бацькоў.

**4 Адзначце спалучэнні слоў, якія не з'яўляюцца словазлучэннямі:**
1) на працягу тыдня;
2) самы разумны;
3) дзень за днём;
4) важная сустрэча;
5) гатаваць вячэру.

**5 Адзначце словазлучэнні з памылкамі ў кіраванні:**
1) насміхацца над імі;
2) займацца па вечарам;
3) забегчы да маці;
4) спатыкнуцца на пень;
5) загадчык кінатэатра.

# ПРОСТЫ СКАЗ
# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ПРОСТАГА СКАЗА

## Варыянт 1

**1 Адзначце сказы, якія з'яўляюцца апавядальнымі:**
1) Журчыць між лоз крынічная вада.
2) Вы бачылі поле ў час жніва?
3) Ніколі не спыняйцеся на паўдарозе.
4) Як прыемна пахне збожжа!
5) Світае.

**2 Адзначце двухсастаўныя сказы:**
1) Ноч марозная.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

2) Верасы напаўняюць паветра мядовым пахам.
3) Падрыхтуйце, калі ласка, загад.
4) У лес дроў не возяць.
5) Цёплы ветрык цалуе твар.

**3 Адзначце няпоўныя двухсастаўныя сказы:**
1) У полі снег.
2) У дзверы пастукалі.
3) Пазваніў увечары.
4) Ідзе снег.
5) Часта ездзіць да бацькоў.

**4 Адзначце развітыя двухсастаўныя сказы:**
1) Вольга марыла стаць настаўніцай.
2) Ноч надышла марозная.
3) Дрэвы стаялі зялёныя.
4) Мы стаялі на прыпынку.
5) Святочны дзень.

**5 Адзначце ўскладненыя двухсастаўныя сказы:**
1) Не пазнаць, Беларусь, цябе сёння!
2) Салавейка летняй ночкай разлівае сваю трэль.
3) Горад і вёска апранулі святочны ўбор.
4) У хаце, апрача бацькі, нікога не было.
5) Ніхто, здаецца, не выклікаў падазрэння.

## Варыянт 2

**1 Адзначце сказы, якія з'яўляюцца апавядальнымі:**
1) І дзе на свеце ёсць такая, як Нёман, рэчачка другая?!
2) Мінула восень і зіма.
3) Не шукай ты шчасця, долі на чужым далёкім полі.
4) Колькі хараства і прыволля на прасторах тваіх, Беларусь!
5) Няўжо было заўсёды так?

**2 Адзначце двухсастаўныя сказы:**
1) Марозная ноч.
2) Хлопчык сядзіць, вачэй не зводзіць…
3) Хто пойдзе да дошкі?
4) Пахам мядовым дыхнула ад дрэў.
5) Люблю цябе, мой Нёман родны, мая любімая рака.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**3 Адзначце няпоўныя двухсастаўныя сказы:**
1) Маладзы алешнік па краях крынічкі.
2) Прыйшоў увечары.
3) Мяне паклікалі.
4) Была вясна.
5) Над намі плывуць сінія аблокі.

**4 Адзначце развітыя двухсастаўныя сказы:**
1) Жанчыны сціхлі.
2) Людзі стаялі стомленыя.
3) Рака не зварухнецца.
4) Першае каханне.
5) У калгасную кантору мы прыехалі ноччу.

**5 Адзначце ўскладненыя двухсастаўныя сказы:**
1) Як урач, забараняю вам начную работу!
2) Два грузчыкі, Алесь і Мазалёк, умасціліся спераду, каля самай кабіны.
3) Слаўцеся навекі, дружба, згода, лад!
4) Яшчэ, як той казаў, не ўсё скончана.
5) Ніхто, аднак, не сустрэў яе ні на сцежцы, ні на двары.

## Варыянт 3

**1 Адзначце сказы, якія з'яўляюцца апавядальнымі:**
1) У колькі пачынаецца экзамен?
2) У паход выбіраліся рана, а пятай гадзіне.
3) Міхась, заходзь хутчэй у пакой.
4) Як прыемна вяртацца дамой!
5) Магазін чамусьці на замку.

**2 Адзначце двухсастаўныя сказы:**
1) Возера Свіцязь, апетае Міцкевічам.
2) Ніхто не скарыць ніколі агню і вады стыхіі.
3) Мне пра тое здарэнне нічога не сказалі.
4) На ўскраіне вёскі вадзяны млын.
5) Усё напісанае забывалася.

**3 Адзначце няпоўныя двухсастаўныя сказы:**
1) У лясах Беларусі дваццаць восем парод дрэў.
2) У Палацы мастацтваў адкрыта выстава твораў украінскіх мастакоў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

3) Потым усхапілася і ўзяла ў руку напісаную паперу.
4) Завярнуў з вуліцы сцежкаю да рэчкі.
5) Сонечны дзень.

**4 Адзначце развітыя двухсастаўныя сказы:**
1) Пачыналася вясна.
2) Бацька вярнуўся вясёлы.
3) У шырокім лузе над крыніцай шуміць духмяная трава.
4) Цяжкае становішча.
5) Зелянеюць луг і поле.

**5 Адзначце ўскладненыя двухсастаўныя сказы:**
1) На жаль, дарога была кепская.
2) Я люблю Беларусь, сваю маці цудоўную.
3) Васільку, папрасі брата прынесці рэчы з машыны.
4) Усе ўрокі, уключаючы і спевы, праводзіла тады ў нас адна настаўніца.
5) Добра жыць і тварыць пад радзімай зарой.

## Варыянт 4

**1 Адзначце сказы, якія з’яўляюцца апавядальнымі:**
1) Як прыемна знаходзіцца ў зімовым лесе!
2) Вы выканалі практыкаванне?
3) Напішы яму, Алеська, ды хутчэй.
4) Гэты дождж надоўга.
5) Раніца.

**2 Адзначце двухсастаўныя сказы:**
1) Экзамен цяжкі.
2) Завод пабудавалі гады тры назад.
3) Людзі некуды спяшаліся.
4) На поўдні і ў Прыдняпроўі нават вінаград беларускіх гатункаў.
5) Апошнія хвіліны расставання.

**3 Адзначце няпоўныя двухсастаўныя сказы:**
1) Для мяне ўсё гэта было вялікім адкрыццём.
2) Паклікалі тады на дапамогу дзядзьку Антона.
3) Аднымі рукамі няamong зробіш.
4) Ідуць заняткі.
5) Павіншавала бацькоў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**4 Адзначце развітыя двухсастаўныя сказы:**
1) Косця марыў стаць журналістам.
2) На дарозе галалёдзіца.
3) Вада ў рэчцы чыстая.
4) Добрае надвор'е.
5) Мы ўважліва слухалі.

**5 Адзначце ўскладненыя двухсастаўныя сказы:**
1) Марозны снег пад нагамі парыпвае гучна і бадзёра.
2) Спі, маці-зямля, пасля дзённае зморы.
3) Мы тут самі, Пілiп Гардзеевіч, сабралі прыёмнік.
4) Адным словам, выгляд у нас быў сапраўдных паляўнічых.
5) З непрывычкі ныла спіна.

## Варыянт 5

**1 Адзначце сказы, якія з'яўляюцца апавядальнымі:**
1) Для шчасця вашага, сыны, бацькі на ўсё гатовы.
2) Вы бачылі новага настаўніка?
3) Ці паедзеце сёлета да сваіх?
4) Як утульна ў вашай хаце!
5) Схадзі, калі ласка, у магазін.

**2 Адзначце двухсастаўныя сказы:**
1) Апошні залік.
2) Апошнія маслюкі і зялёнкі змерзлі.
3) Такое ніколі не забываецца.
4) А назаўтра два лісты.
5) Маю пэўную надзею толькі на вас.

**3 Адзначце няпоўныя двухсастаўныя сказы:**
1) Хвіліны праз дзве схаваліся за горкай.
2) Хутка выберуся ад вас.
3) Каля дома дрэва.
4) Апошнія хвіліны расставання.
5) Купіла ўсё неабходнае.

**4 Адзначце развітыя двухсастаўныя сказы:**
1) Апошняя наша сустрэча.
2) Дзень прыйшоў святочны.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

3) На стале кветкі.
4) Яе дачка ўжо замужам.
5) Пагоркі і даліны купаюцца ў вясеннім сонцы.

**5 Адзначце ўскладненыя двухсастаўныя сказы:**
1) Спакойна, разважна цячэ размова.
2) Расці, лён, высокім.
3) У рэчцы пад карчамі, калі я не памыляюся, водзяцца ракі.
4) Дошка трэснула, відаць, ад марозу.
5) Позні вераснёўскі вечар.

# ДЗЕЙНІК

## Варыянт 1

**1 Адзначце сказы, у якіх дзейнік з'яўляецца марфалагізаваным:**
1) Кожны сабе дабра жадае.
2) З незвычайнай яскравасцю паўстала перад ёю даўняе, перажытае.
3) Мужчыны няёмка маўчалі.
4) Ніхто не зможа вычарпаць крыніцы.
5) Стаяць ля маладых гадоў, ля чалавечага дзяцінства – вялікі гонар.

**2 Адзначце сказы, у якіх дзейнік з'яўляецца простым:**
1) Шчасліваю доляй жыццё расцвіло.
2) Нішто спыніць не можа вольнай сілы рух.
3) Па беразе возера Свіцязь любіў хадзіць Адам Міцкевіч.
4) Бацька з сынам пілаваў дровы.
5) Адзін з нас пойдзе ў разведку.

**3 Адзначце сказы, у якіх дзейнік з'яўляецца састаўным:**
1) Снег-сняжок шые шыр узорам.
2) Усе любяць свой край.
3) Быць студэнтам – пачэсная праца.
4) Ідзе снег.
5) Адна з хворых прасіла піць.

**4 Адзначце сказы, у якіх дзейнік з'яўляецца складаным:**
1) Лічыцца першым – вялікі гонар.
2) Каля Браслаўскіх сініх азёр гусі-лебедзі мыліся.
3) Ніхто з пяці не прамовіў ні слова.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

4) Міхал ідзе ў свае абходы.
5) За сталом сядзеў сам гаспадар.

**5 Адзначце сказы, у якіх інфінітыў уваходзіць у склад дзейніка:**
1) Жыць – Радзіме служыць.
2) У зямлянцы нязручна жыць.
3) Гаварыць пра пасляваенныя цяжкасці таксама не нова.
4) Жаданне паступіць не пакідала яе.
5) Неба пачынала святлець.

## Варыянт 2

**1 Адзначце сказы, у якіх дзейнік з’яўляецца марфалагізаваным:**
1) І старыя, і маладыя высыпалі на вуліцу паглядзець на шэсце.
2) Прыйшло пісьмо ад Турсевіча.
3) Высока над зямлёю прыгожымі шнурамі ляцелі жураўлі і гусі.
4) Вучыцца ніколі не позна.
5) Не шукай ты шчасця, долі на чужым далёкім полі.

**2 Адзначце сказы, у якіх дзейнік з’яўляецца простым:**
1) У бары шумяць сосны-елачкі.
2) На ўзлеску стаяць вартавыя і ўважліва аглядаюць наваколле.
3) Кожны з прысутных на мітынгу адчуваў нейкую прыўзнятасць.
4) Бацька з сынам пілавалі дровы.
5) Лозы застылі над рэчкай.

**3 Адзначце сказы, у якіх дзейнік з’яўляецца састаўным:**
1) Стаць заможнымі не так проста.
2) Алеі, алеі шумяць над ракой.
3) Стаць за лесніка не ў яго натуры.
4) Вузкай сцяжынкай цераз поле ішоў незнаёмы.
5) Атрад матросаў знаходзіўся на станцыі.

**4 Адзначце сказы, у якіх дзейнік з’яўляецца складаным:**
1) Пачаць вучыцца – добрая справа.
2) На падворку ляжалі кучы саломы.
3) Адзін з увайшоўшых спыніўся каля дзвярэй.
4) Усе студэнты прыйшлі на заняткі.
5) За сталом сядзела гаспадыня.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

**5 Адзначце сказы, у якіх інфінітыў уваходзіць у склад дзейніка:**
1) Мяне папрасілі прыйсці.
2) Уцякаць – сораму набрацца.
3) Лічылася за гонар быць выбранай.
4) Стаць лепшай – яе жыццёвая задача.
5) Мы прыехалі адпачываць.

## Варыянт 3

**1 Адзначце сказы, у якіх дзейнік з’яўляецца марфалагізаваным:**
1) Адны былі расстраляны, другія вывезены ў Германію, трэція загінулі ў часе шматлікіх бамбёжак.
2) І гэта мае абавязкі.
3) Мужчыны няёмка маўчалі.
4) Зноў была вясна, прыгожая, маладая.
5) Ніхто не можа ведаць усё.

**2 Адзначце сказы, у якіх дзейнік з’яўляецца простым:**
1) Кожны з нас памятае прачытаную ў юнацтве першую кнігу.
2) Лес зноў расступіўся, даючы месца бясконца вялікім балотам.
3) На небе ляжалі пашматаныя воблакі, нізкія і высокія, пёрыстыя і дажджавыя.
4) Дачка з маці засталіся ўдвух.
5) Ты прыйдзеш сёння?

**3 Адзначце сказы, у якіх дзейнік з’яўляецца састаўным:**
1) Усё жывое разамлела, замерла, стаілася.
2) Нехта з хлопцаў наважыўся пераскочыць праз вогнішча.
3) Але ўсё ж гэта вялікае шчасце – быць маці.
4) Адзін з воінаў звярнуўся да грамадзян.
5) Быць настаўнікам – вялікі гонар.

**4 Адзначце сказы, у якіх дзейнік з’яўляецца складаным:**
1) А вёсны, вёсны палаюць да неба.
2) Нехта з хлопцаў наважыўся пераскочыць праз вогнішча.
3) У вайну шляхі-дарогі іх разышліся.
4) У галаве ў дзеда Талаша прамільгнула некалькі думак.
5) Толькі праз родную мову чалавек можа стаць беларусам.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**5 Адзначце сказы, у якіх інфінітыў уваходзіць у склад дзейніка:**
1) Вера прапанавала сустрэцца ў наступным годзе.
2) Вельмі часта ў жыцці паўстае неабходнасць азірнуцца.
3) Хадзілі мы некалі з цёткаю ў лес збіраць зёлкі.
4) Даравацъ – значыць зразумець і паверыць.
5) Жаданне вучыцца трэба заўсёды вітаць.

## Варыянт 4

**1 Адзначце сказы, у якіх дзейнік з’яўляецца марфалагізаваным:**
1) Усе сустракалі мяне з усмешкай.
2) Нехта прызначыў Ірыне спатканне.
3) Хто сустракаў цябе?
4) Прачытанае доўга трымаецца ў памяці.
5) Бацька хутка вярнуўся.

**2 Адзначце сказы, у якіх дзейнік з’яўляецца простым:**
1) На двары стаяла трое незнаёмых.
2) Усё напісанае забылася.
3) Заняткі тады праводзіліся праз дзень.
4) Сястра з братам прыехала ў Мінск.
5) Ты пачакай мяне на прыпынку.

**3 Адзначце сказы, у якіх дзейнік з’яўляецца састаўным:**
1) Ніхто з нас гэтага не заўважыў.
2) Гаварыць пра пасляваенныя цяжкасці таксама не нова.
3) Быць адказным – вялікая справа.
4) Кожны займаўся сваёй справай.
5) Быць студэнтам – пачэсны гонар.

**4 Адзначце сказы, у якіх дзейнік з’яўляецца складаным:**
1) Хады-пераходы мільгаюць стракатай замежнаю модай.
2) Добрая справа – пачаць вучыцца.
3) За акном віднеліся тры разгалістыя хвоі.
4) Усякі з нас летняму дожджыку рад.
5) Сыпаў дробненькі сняжок.

**5 Адзначце сказы, у якіх інфінітыў уваходзіць у склад дзейніка:**
1) Вышываць мяне навучыла бабуля.
2) Настаўніца параіла мне паступаць ва ўніверсітэт.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

3) Вучыць – справа адказная і няпростая.
4) Весела бег Данік дадому расказаць пра экзамен.
5) Мама зразумела маё жаданне пагаварыць.

## Варыянт 5

**1 Адзначце сказы, у якіх дзейнік з’яўляецца марфалагізаваным:**
1) Яна ганарылася сваім бацькам.
2) І старыя, і маладыя прыйшлі на сустрэчу.
3) Адказ я вам дам пазней.
4) Мінулае так часта паўстае перад вачыма.
5) Маці спазнялася на аўтобус.

**2 Адзначце сказы, у якіх дзейнік з’яўляецца простым:**
1) Усе заявы былі разгледжаны.
2) Кожны з нас павінен быў прынесці свой малюнак.
3) Экзамены пачыналіся рана.
4) Мы з сяброўкамі спяшаліся на сустрэчу.
5) У бары шумяць сосны-елачкі.

**3 Адзначце сказы, у якіх дзейнік з’яўляецца састаўным:**
1) Лічылася за гонар быць выбранай.
2) Навучыцца іграць нялёгка.
3) Адзін з увайшоўшых спыніўся каля дзвярэй.
4) Ёсць шмат цікавага на ўсходзе.
5) Часам я рабіў памылкі ў рабоце.

**4 Адзначце сказы, у якіх дзейнік з’яўляецца складаным:**
1) Стаць іншай – яе задача.
2) Міхал ідзе ў свае абходы.
3) Ніхто з пяці не прамовіў ні слова.
4) Здалёк былі бачны кучы саломы.
5) Сёння ярка свяціла сонейка.

**5 Адзначце сказы, у якіх інфінітыў уваходзіць у склад дзейніка:**
1) Век пражыць – не поле перайсці.
2) Мне дырэктар прапанаваў выступіць на сходзе.
3) Дзетак узгадаваць – не грыбкоў назбіраць.
4) У ёй прачнулася жаданне вучыцца.
5) Мы спрачацца не хацелі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# ВЫКАЗНІК

## Варыянт 1

**1 Адзначце сказы, у якіх выказнік з'яўляецца простым дзеяслоўным:**
1) Арол кружыць у паднябессі.
2) Яна вельмі мілая з твару.
3) І тут шусь да нас у хату сабака.
4) Зайздросны мароз узяў ды пазакрываў лёдам і снегам шыбы на вокнах.
5) Гэтая справа не для нас.

**2 Адзначце сказы, у якіх выказнік з'яўляецца састаўным дзеяслоўным:**
1) Я буду чакаць вас.
2) Бацькі папрасілі мяне дапапагчы ім.
3) Вольга вельмі хацела паступіць ва ўніверсітэт.
4) Вучні ўважліва слухаюць настаўніка.
5) Ля кустоў пачынаў ужо завязвацца туман.

**3 Адзначце сказы, у якіх выказнік з'яўляецца састаўным іменным:**
1) Дык ты неўзабаве гаспадаром будзеш!
2) Дзень быў ясны, блакітны.
3) У тую ноч разведка была пад самым бокам фашысцкага гарнізона.
4) Звычайна пад раніцу завея быццам улягалася, слабела.
5) Студэнты абавязаны вучыцца.

**4 Адзначце сказы, у якіх дапушчана памылка ў каардынацыі дзейніка і выказніка:**
1) Многа зуброў жыве ў Белавежскай пушчы.
2) Доктар Шапавалава паехаў да хворага.
3) Нехта з прамоўцаў высока ўзняў над галавою руку.
4) Абодва пасажыры некаторы час сядзела моўчкі.
5) Восем шклозаводаў працуе на Беларусі.

**5 Адзначце сказы, у якіх інфінітыў уваходзіць у склад выказніка:**
1) Мы тыя сінія арэлі зламаць нікому не далі б.
2) Не любіў чалавек камандаваць, загадваць.
3) І пачаў быў капаць ужо, але спыніўся.
4) Ты куды будзеш паступаць?
5) Студэнты ішлі здаваць экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# Варыянт 2

**1 Адзначце сказы, у якіх выказнік з'яўляецца простым дзеяслоўным:**
1) Раптам хтосьці ўзяў ды патушыў лучыну на печы.
2) Усе ціснуцца-лезуць наперад.
3) Гэта была незвычайная для Старых Сялібаў навіна!
4) Маці слязу пусціла.
5) Праезд часова закрыты.

**2 Адзначце сказы, у якіх выказнік з'яўляецца састаўным дзеяслоўным:**
1) І ўвесь час  звіняць, звіняць, звіняць песні.
2) І ўсё ж водгулле будзе доўга звінець.
3) З той вечарынкі пачалі мы сустракацца з Мірай.
4) Я магу прапанаваць табе і іншы варыянт.
5) Ніхто ў калгасе не лічыў старога вартаўніка за выдатнага паляўнічага.

**3 Адзначце сказы, у якіх выказнік з'яўляецца састаўным іменным:**
1) Мечык ужо адчуваў сябе першым спецыялістам у бабровых справах.
2) Вечары апускаюцца маўклівыя і кароткія.
3) І зноў нясцерпная цішыня падпаўзла-падкралася да бацькі і сыноў.
4) Мы будзем імкнуцца да неба, да зор.
5) З гэтай вясны Мітрыч быў у іх за брыгадзіра.

**4 Адзначце сказы, у якіх дапушчана памылка ў каардынацыі дзейніка і выказніка:**
1) Ідуць чатыры дзяўчынкі і бабуля.
2) Нямала звяроў жывуць у нетрах пушчы.
3) Большасць дэлегатаў ужо сядзела на сваіх месцах.
4) Сто тысяч яблыняў і груш вырасла ў дзедавым садзе.
5) Цярпліва чакалі сваёй пары круглае лісце пралесак.

**5 Адзначце сказы, у якіх інфінітыў уваходзіць у склад выказніка:**
1) Уладзімір Іванавіч папрасіў прынесці яму фотаапарат.
2) Я хацеў узважыць свой багаж папярэдне.
3) Алёша падаў знак падрыхтавацца.
4) Я не магу пагадзіцца з такой прапановай.
5) Грыбок загадваў усім ісці ў Іванаву хату на сход.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## Варыянт 3

**1 Адзначце сказы, у якіх выказнік з’яўляецца простым дзеяслоўным:**

1) А хвалі ідуць, ідуць, шоргаючы белымі грабянцамі.
2) Агатка ўжо была выбралася да Ганны, суседкі сваёй.
3) Мечык нібы заснуў.
4) Лось – вялікі майстар прабірацца па балоце.
5) Яна невысокага росту.

**2 Адзначце сказы, у якіх выказнік з’яўляецца састаўным дзеяслоўным:**

1) Вуліца кідае-рассыпае прыпевы і невыразныя галасы, поўныя весялосці.
2) Маці папрасіла мяне схадзіць да бабулі.
3) Юля гатова здаваць усе экзамены.
4) Хлопцы не ўмелі слухаць.
5) Сінтаксіс – гэта раздзел мовазнаўства.

**3 Адзначце сказы, у якіх выказнік з’яўляецца састаўным іменным:**

1) Ён захацеў расчыніць акно.
2) Конь усё яшчэ стаяў запрэжаны.
3) Сама не свая хадзіла Дар’я.
4) Даніла стаў яму за бацьку.
5) Бацька збіраўся касіць траву.

**4 Адзначце сказы, у якіх дапушчана памылка ў каардынацыі дзейніка і выказніка:**

1) Большасць сялян насіла простыя паясы, з лёну ды воўны.
2) Толькі тры экзамены засталіся.
3) Шмат птушак сабраліся ў велічэзныя гурты.
4) Закройшчык Сазонава перавыканала план.
5) Тут сабралася не менш як дзесяць тысяч чалавек.

**5 Адзначце сказы, у якіх інфінітыў уваходзіць у склад выказніка:**

1) Усе мы хочам пражыць на зямлі здаровымі і багатымі.
2) Нарэшце мы выбраліся ў млын змалоць пшаніцу і грэчку.
3) Васіль прасіў брата перанесці рэчы з машыны.
4) Ты будзеш чытаць гэту кнігу?
5) Жыць – Радзіме служыць.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# Варыянт 4

**1 Адзначце сказы, у якіх выказнік з'яўляецца простым дзеяслоўным:**

1) Тады Пятрусь узяў ды падказаў сябру рашэнне.
2) І крынічка яшчэ доўга будзе паіць вадою ўсіх падарожных.
3) З лесу пачулася страляніна.
4) Вокны былі наўсцяж расчынены.
5) Юля гатова здаваць усе экзамены.

**2 Адзначце сказы, у якіх выказнік з'яўляецца састаўным дзеяслоўным:**

1) Такое ніколі не забываецца.
2) Ужо з першага класа Света хацела стаць спявачкай.
3) Школа, я рад з табой сустрэцца.
4) Дзядзька Антось папрасіў нас прыйсці раней.
5) Заўтра мы будзем сустракацца на плошчы Незалежнасці.

**3 Адзначце сказы, у якіх выказнік з'яўляецца састаўным іменным:**

1) Некаторыя лататы хацелі даць, спалохаўшыся дзеда.
2) Сёння школа стала зусім іншая.
3) Яны былі людзі набожныя.
4) Грамадства не можа быць абыякавым да лёсу сваёй культуры.
5) Нарэшце мы выехалі з лесу.

**4 Адзначце сказы, у якіх дапушчана памылка ў каардынацыі дзейніка і выказніка:**

1) Нямала дрэў жыве значна больш, чым самыя даўгавечныя жывёлы.
2) Шмат дарожак і сцяжынак ляжаць да нашых хат.
3) Значная частка зуброў жывуць на волі.
4) Грамада людзей сабралася ў адну кучу.
5) Некалькі дзесяткаў чалавек жыве тут.

**5 Адзначце сказы, у якіх інфінітыў уваходзіць у склад выказніка:**

1) Міця паехаў наведаць свайго даўняга прыяцеля.
2) Быкаў навучыў мяне разумець вайну.
3) Бацька пайшоў сустракаць дачку на прыпынак.
4) Саша не хацела ўспамінаць мінулае.
5) Ваша задача – прааналізаваць верш.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# Варыянт 5

**1 Адзначце сказы, у якіх выказнік з'яўляецца простым дзеяслоўным:**

1) Мова – найважнейшы сродак зносін паміж людзьмі.
2) Заўсёды славіўся Слуцк сваімі пладовымі садамі.
3) Марына старэйшая за брата.
4) Я буду з нецярплівасцю чакаць пісьма.
5) Ластаўка весела шчабеча на саламянай страсе хаты.

**2 Адзначце сказы, у якіх выказнік з'яўляецца састаўным дзеяслоўным:**

1) Я зрабіў бы гэта і без тваёй дапамогі.
2) Гадзіннік няўмольна лічыць і лічыць хвіліны.
3) Гэта справа не для нас.
4) Хату зрабіць – не скрынку збіць.
5) Міхась умеў сыходзіцца з цікавымі людзьмі.

**3 Адзначце сказы, у якіх выказнік з'яўляецца састаўным іменным:**

1) Без буслоў бяздоннае сіняе неба становіцца пустым і нецікавым.
2) Рэчка зімой была не такая, як летам.
3) Яна даўно ўжо была замужам.
4) Васька быў старэйшы за нас гады на чатыры.
5) Камбайнеры схапіліся за жываты.

**4 Адзначце сказы, у якіх дапушчана памылка ў каардынацыі дзейніка і выказніка:**

1) На кансультацыю прыйшлі ўсяго толькі пяць вучняў.
2) Ветэрынар Зотава прызначыла маладняку асобы рацыён.
3) Цэлая калона машын прайшла праз скрыжаванне дарог з захаду на ўсход.
4) Праз некаторы час ля школы сабралася вялікая група хлопцаў.
5) Многа вучняў яшчэ сядзелі ў актавай зале.

**5 Адзначце сказы, у якіх інфінітыў уваходзіць у склад выказніка:**

1) Маці не дазваляла ў такі час громка размаўляць.
2) Алёша падаў знак падрыхтавацца.
3) Пасля абеду Галынскі пайшоў адпачыць.
4) Паверыць у сябе – галоўнае.
5) Гадоў з дванаццаці Сямён Рыгоравіч стаў браць Віцю з сабой у поле.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# ДАДАНЫЯ ЧЛЕНЫ СКАЗА

## Варыянт 1

**1 Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з'яўляюцца азначэннямі:**

1) Была яна гадоў на пятнаццаць *маладзейшая* за Марка.
2) У *кожнага* ў гэты вечар былі свае клопаты.
3) Мне патрэбен падручнік *па* сучасным *мастацтве*.
4) *Кожны* чалавек – гэта цэлы свет.
5) Уздоўж дарогі стаялі *зялёныя* дубы.

**2 Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з'яўляюцца недапасаванымі азначэннямі:**

1) Шмат рэчак і рэчачак цякло па *гэтай* зямлі.
2) *Кожная* праца, *кожная* справа мае свой пачатак і свой канец.
3) У зорныя вечары месячны лес чула прытуліў галасы зімовых *птушак*.
4) Камісія не абмінула Васілёвай хаты, перамерала і *яго* поле.
5) Пахнуць *нераспелыя* суніцы.

**3 Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з'яўляюцца прамымі дапаўненнямі:**

1) Больш за ўсё ён баяўся нечаканай *сустрэчы*.
2) Бацька ўважліва глядзеў *на сына*.
3) *Неба* дажджліваю хмарай абложана.
4) *Гэтага* я і чакаў.
5) *Нікога* і *нічога* ў тую ноч не бачылі.

**4 Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з'яўляюцца прыдаткамі:**

1) У гэты час каля *возера* Валовае сустрэлася некалькі чалавек.
2) *Дзед* Аляксей з вёскі Паняцічы ў сваім даўгалетным жыцці ніколі не адступаў ад урадавых законаў.
3) Зусім недалёчка адсюль і Свіслач са сваімі непахіснымі *вартавымі*-дубамі на ўзбярэжжы.
4) Чырвоны касцёл знаходзіцца на плошчы *Незалежнасці*.
5) Хата-*чытальня* сёння ўжо поўная з самага ранку.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**5 Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з’яўляюцца акалічнасцямі:**

1) Вёска *за рэчкай* таксама называлася Балачанкай.
2) Не адыходзь, тваё месца *побач*.
3) Серафім мыўся *не спяшаючыся*.
4) А *вакол* травіцы роснай рай і бярозак белая сям’я.
5) Студэнты пайшлі *на перапынак*.

## Варыянт 2

**1 Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з’яўляюцца азначэннямі:**

1) Дзверы былі толькі *прычыненыя*.
2) Сёння зоры *іскрыстыя, квяцістыя*, і ўсыпана імі ўсё неба.
3) Задача *па матэматыцы* аказалася цяжкай.
4) Хто сказаў, што ноччу маўчыць мой *абсыпаны зоркамі* горад?
5) Стаяла *марозная* ноч.

**2 Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з’яўляюцца недапасаванымі азначэннямі:**

1) Зорка *срэбная* ўпала ў ваду.
2) Дарогу *да Бярозава* таксама недзе замяло.
3) Ідуць касцы, звіняць *іх* косы.
4) Суседам *справа* аказаўся дзед Мікіта.
5) Я прыехаў пажыць у родным свеце *майго* маленства і маладосці.

**3 Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з’яўляюцца прамымі дапаўненнямі:**

1) Ад сяла і да сяла *лазні* ўзносіцца хвала.
2) Дзень кожны *гук* на павуцінку ніжа.
3) Мне хочацца дзяўчынцы на памяць падарыць *расінку* на травінцы, агарачак расы.
4) Вярба рукамі, кволымі, худымі, *маладзічок* трымала за ражкі.
5) Я ляжаў *са стрэльбаю* за камлём і не зводзіў вачэй з лісы.

**4 Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з’яўляюцца прыдаткамі:**

1) Настаўнік Лабановіч – галоўны герой трылогіі Якуба Коласа *“На ростанях”*.
2) Ціха цячэ тут Арэса-*рака*.
3) Спрабуе чалавек дабрацца ўжо і да *планеты* Марс.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

4) Насеялі ў адным полі канюшыны-*дзятліку*.
5) Лявона перапыніў бродаўскі *каваль* Атрахім Апалонік.

**5 Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з'яўляюцца акалічнасцямі:**
1) Коні *аніводнага разу* не спыніліся.
2) *Раптам* над іх галовамі пачуўся голас.
3) *Пасярэдзіне двара* стаяла вялізная прысадзістая будыніна.
4) Ён ужо *дома*.
5) Мы ўбачылі абеліск з зоркай *наверсе*.

## Варыянт 3

**1 Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з'яўляюцца азначэннямі:**
1) У песнях мне шумеў чарот пра *нарачанскія* азёры.
2) Дзядзька Марцін быў яшчэ не *стары* чалавек.
3) Вада ў возеры на дзіва *чыстая* і *светлая*.
4) *Першы жоўты* лісток на бярозе з'яўляецца вельмі рана.
5) У цясноце зялёнага дворыка цвітуць *белыя* і *чырвоныя* ружы.

**2 Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з'яўляюцца недапасаванымі азначэннямі:**
1) Батальён з крыкам "*ура*" падняўся ў поўны рост і кінуўся ў атаку.
2) Добры вечар дарозе *дадому*, вясёлым калёсам, агням на сялібах знаёмых, і зорам, і росам.
3) *Казачныя* прыгоды дзяцей хвалююць да *нервовага* ўзбуджэння...
4) Сонейка пачынала *новы* дзень.
5) Экзамен *па хіміі* быў вельмі цяжкім.

**3 Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з'яўляюцца прамымі дапаўненнямі:**
1) Мора дыхала па-ранейшаму *цеплынёю, радасцю, шчасцем, летам*.
2) Мы дзецям *горад* свой перададзім...
3) Народныя думы і казкі давалі *мне* сілы нямала.
4) Кожны з нас памятае прачытаную ў юнацтве першую *кнігу*.
5) Я прыйшоў сюды *разам з бацькамі*.

**4 Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з'яўляюцца прыдаткамі:**
1) Хто не любіць *красуні*-вясны, калі месяц так хораша свеціць!

РЭПОЗІТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

2) Цётка *Тацяна* развіталася з Андрэем і накіравалася да сваёй хаты.
3) Кланялася жыта раніцы, прастору, караблям-*камбайнам*, што прыйшлі ў пору.
4) Я чую заўжды сваю *Бесядзь*-раку і шчырыя, родныя матчыны песні.
5) Студэнт *Кандраценка* быў хутка адлічаны.

**5 Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з'яўляюцца акалічнасцямі:**
1) *Пад вечар* шэрыя хмаркі затулілі ўсё неба.
2) Лабановіч *з цікавасцю* разглядаў хату.
3) Працуе Мінск *і днём і ноччу* ў такт з рэспублікай усёй.
4) Прыходзіў дзядзька *пагаманіць* з гадзіну перад сном.
5) Яе дачка была ўжо *замужам*.

## Варыянт 4

**1 Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з'яўляюцца азначэннямі:**
1) Цяпер паравозы *нашы*, дарогі *нашы*, дзяржава *наша*.
2) Векавыя дубы стаяць *паважныя*, *спакойныя* ў сваёй велічы.
3) На *другі* дзень надвор'е выдалася зусім добрае.
4) Мне ж *кожная* сцежка тут добра знаёма з маленства.
5) Добра сядзець пад *ластаўчынымі* гнёздамі, што туляцца пад страхою *матчынай хаткі*.

**2 Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з'яўляюцца недапасаванымі азначэннямі:**
1) *Напісанае чалавекам* слова праз сотні і тысячы год можа загучаць вялікай сілай.
2) Конны атрад *з трыццаці чалавек* рыссю імчаўся па лясным шляху, пераходзячы часам у галоп.
3) І *панскі* дом з ласіным рогам на Міхася глядзеў астрогам.
4) У мяне з'явілася надзея *вярнуцца* на фронт.
5) Вецер настойліва гнаў з неба *нізкае* ашмоцце хмар.

**3 Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з'яўляюцца прамымі дапаўненнямі:**
1) Пяю *пра сёння* з любасцю, бо сэрца расцвіло.
2) Тым часам хлопцы падрасталі, *старэйшым* дома памагалі.
3) Час гоіць нават самыя балючыя *раны*.
4) Дубы любяць сонечнае *святло*, *цеплыню*.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

5) Дубы не баяцца *вільгаці*.

**4 Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з’яўляюцца прыдаткамі:**

1) Выдатна родзяць у нас бульба і *лён*-даўгунец.
2) У часопісе “*Полымя*” надрукаваны многія раманы беларускіх пісьменнікаў.
3) На доўгія вёрсты і мілі раскінуў лес-*волат* шатры.
4) Зорка *Венера* ўзышла над зямлёю.
5) Бор шуміць над *ракой* Арэсай.

**5 Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з’яўляюцца акалічнасцямі:**

1) *Навокал* сакаталі конікі.
2) *Тройчы ў дзень* прыходзіць сюды з райцэнтра невялікі рэйсавы аўтобус.
3) *Штодня* прачынаецца буднічны ранак.
4) Дзесьці ў гушчары *спрасонку* пракрычала нейкая птушка.
5) Летам у лесе *хораша*.

## Варыянт 5

**1 Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з’яўляюцца азначэннямі:**

1) Без буслоў бяздоннае сіняе неба становіцца *пустым* і *нецікавым*.
2) *Матчыны* рукі ніколі не чуюць цяжару *свайго* дзіцяці.
3) Пад *яркім* сонцам у *сінім* небе радасна іскрыцца возера.
4) Нізкія берагі Бярэзіны дзе-нідзе *акаймаваны* кустамі лазы.
5) *Пеністыя* хвалі з *глухім* шумам б’юцца аб берагі.

**2 Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з’яўляюцца недапасаванымі азначэннямі:**

1) *Пясчаная* дарога ішла якраз праз *густы сасновы* лес.
2) Дарогу *праз лес* праехалі непрыкметна.
3) Нарэшце Гаравы перайшоў да задач *на сёння*.
4) Звонкія галасы *дзяцей* напоўнілі наваколле.
5) Старшыня камісіі – мужчына *гадоў за трыццаць*.

**3 Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з’яўляюцца прамымі дапаўненнямі:**

1) *Пра маладосць* пяюць бярозы, *пра вечнасць* – хмурыя дубы.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

2) Дзеці перанеслі *дровы* ў хлявок.
3) Лабановіч любіць сваю новую *школу*.
4) Бярозка ў люстры возера любуецца сваёй зялёнай *кронаю*.
5) Слова, *дум* ніхто не звяжа.

**4 Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з’яўляюцца прыдаткамі:**
1) Мароз-*мастак* рукой старэчай на шыбах піша свой узор.
2) Надзвычай роўныя і высокія прыгажуні-*сосны* гойдаліся ад ветру.
3) Хаджу я па вуліцы горада-*сада*, узрушаны, горды гляджу навакол.
4) І выходзілі хлопцы-*вяскоўцы* на бой.
5) Над Віллёй-*ракой*, па гары крутой туман сцелецца.

**5 Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы з’яўляюцца акалічнасцямі:**
1) Спыніліся *перадыхнуць*.
2) Вецер пачаў шумець *мацней*.
3) *Весела* на полі, *слаўна* пад бярозкай.
4) Наш рух *уперад* нікому не спыніць.
5) *Здалёк* і *зблізку* бялеюцца на дубах буслы.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# АДНАСАСТАЎНЫ СКАЗ

## Варыянт 1

**1 Вызначце від аднасастаўнага сказа *Ужыванне формы аднаго ладу са значэннем другога найчасцей сустракаем у гутарковым і мастацкім стылях*:**
1) пэўна-асабовы;
2) няпэўна-асабовы;
3) абагульнена-асабовы;
4) безасабовы;
5) інфінітыўны.

**2 Адзначце аднасастаўныя намінатыўныя сказы:**
1) У лясах Беларусі дваццаць восем парод дрэў.
2) Двары і дарожкі акуратна выкладзены аднолькавага памеру камянямі або пліткамі.
3) У палацы мастацтваў адкрыта выстава твораў украінскіх мастакоў.

4) Вось чэк, падпісаны загадчыкам секцыі.
5) Марозны дзень.

**3 Адзначце аднасастаўныя пэўна-асабовыя сказы:**
1) Сардэчна дзякую вам за дапамогу.
2) У паход выбраліся рана, а пятай гадзіне.
3) А мне патэлефанавалі ўчора.
4) Пастукаў у адчыненае акно.
5) Прыходзь да мяне ўвечары.

**4 Адзначце аднасастаўныя няпэўна-асабовыя сказы:**
1) Учора ўвесь вечар спявалі.
2) Паклікалі тады на дапамогу дзядзьку Антона.
3) Хутка ў горад выберамся.
4) Нарэшце прыйшла.
5) Не заснеш у весні вечар.

**5 Адзначце аднасастаўныя безасабовыя сказы:**
1) Ні плуга, ні каня, ні бараны няма ў яго ў тым двары.
2) Убачыць толькі б хоць на міг сваю радзімую старонку!
3) Мне хацелася б больш ведаць пра гэту арганізацыю.
4) Нялёгка яму будзе з такім характарам.
5) У нас хату часта будуюць талакою.

## Варыянт 2

**1 Вызначце від аднасастаўнага сказа *Без вады ўвогуле няма жыцця*:**
1) пэўна-асабовы;
2) няпэўна-асабовы;
3) абагульнена-асабовы;
4) безасабовы;
5) інфінітыўны.

**2 Адзначце аднасастаўныя намінатыўныя сказы:**
1) На ўскраіне вёскі вадзяны млын.
2) Возера Свіцязь, апетае Міцкевічам.
3) Гэты дождж надоўга.
4) Вось паліца з лялькамі.
5) Снег.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**3 Адзначце аднасастаўныя пэўна-асабовыя сказы:**
1) Потым усхапілася і ўзяла ў руку напісаную паперу.
2) Напішы яму, Алеська, ды хутчэй.
3) Завярнуў з вуліцы сцежкаю да рэчкі.
4) Хутка выберуся ад вас.
5) Ці паедзеце сёлета да сваіх?

**4 Адзначце аднасастаўныя няпэўна-асабовыя сказы:**
1) Хутка і ў горад выберамся.
2) Чарніцы часта ядуць з малаком.
3) Учора збіралі грыбы, а сёння ўжо і ягады.
4) Нарэшце прыйшлі.
5) Задумаўся пра заўтрашні дзень.

**5 Адзначце аднасастаўныя безасабовыя сказы:**
1) Па-мойму, збіраецца на дождж.
2) Эх, задумацца б і паразважаць над табою, жыццё!
3) Як табе там жывецца адной?
4) Пакой трэба прыбраць.
5) Вёска амаль замецена снегам.

## Варыянт 3

**1 Вызначце від аднасастаўнага сказа *Прасочым развіццё біяцэнозу на новым месцапражыванні, пазбаўленым глебы*:**
1) пэўна-асабовы;
2) няпэўна-асабовы;
3) абагульнена-асабовы;
4) безасабовы;
5) інфінітыўны.

**2 Адзначце аднасастаўныя намінатыўныя сказы:**
1) На стале алоўкі.
2) Вось і рэчка.
3) Спякотнае лета.
4) У яго светлыя валасы і цёмныя вочы.
5) Апошнія хвіліны расставання.

**3 Адзначце аднасастаўныя пэўна-асабовыя сказы:**
1) Гэты дуб распілуюць на тонкія дошкі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

2) Арынка, збіраешся на лета ў вёску ці ў горадзе застанешся?
3) Век жыві, век вучыся.
4) Не хачу быць панскім салаўём.
5) Вельмі хацела паступіць.

**4 Адзначце аднасастаўныя няпэўна-асабовыя сказы:**
1) Дзядзьку Мітрыча за яго трапнае слова хацелі нават на руках пагойдаць.
2) Цяпер саматканыя палотны робяць рэдка, але робяць...
3) Збіраюся да маці.
4) Прыйшла пад раніцу.
5) Газеты, часопісы і лісты прыносяць ранкам і вечарам.

**5 Адзначце аднасастаўныя безасабовыя сказы:**
1) Трэба быць памяркоўным у дачыненні да поглядаў іншых людзей.
2) Нікога не было на двары ў засені агромністай ліпы.
3) Мокрым снегам пляснула ў акно.
4) Толькі горад стары не пазнаць ужо нам.
5) Прыйсці б дамой раней.

## Варыянт 4

**1 Вызначце від аднасастаўнага сказа *Гледзячы на іх, хочацца блукаць па заснежаных палях, любавацца харастввом восеньскіх узлескаў, углядацца ў бяскрайнія прасторы роднай зямлі*:**
1) пэўна-асабовы;
2) няпэўна-асабовы;
3) абагульнена-асабовы;
4) безасабовы;
5) інфінітыўны.

**2 Адзначце аднасастаўныя намінатыўныя сказы:**
1) У гэтым кавалку 10 метраў тканіны.
2) На дарозе галалёдзіца.
3) Вунь і тая груша-дзічка з бусліным гняздом.
4) Апошні дзень заняткаў.
5) Цяжкі экзамен.

**3 Адзначце аднасастаўныя пэўна-асабовыя сказы:**
1) Не рабі ліхога і не бойся нікога.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

2) Люблю наш край – старонку гэту…
3) Эх, выйдзі ў поле, брат, дасвету...
4) Не любіў чытаць мастацкую літаратуру.
5) Гудзела ў коміне.

**4 Адзначце аднасастаўныя няпэўна-асабовыя сказы:**
1) Нарэшце выехалі з лесу на прырэчны прастор.
2) Навуку за плячыма не носяць.
3) З поля прыбралі багаты ўраджай.
4) На экзамен з’явіўся апошнім.
5) Месца для адпачынку выбралі надзвычай добрае.

**5 Адзначце аднасастаўныя безасабовыя сказы:**
1) Вечарамі на вадзяным млыне неяк таямніча і крыху трывожна.
2) Сабрацца б разам дружнай грамадою!
3) Гэтаму чалавеку выпала ў жыцці многа папрацаваць.
4) Не мінуць памылак анікому ў жыцці.
5) Ложак прыбраны.

## Варыянт 5

**1 Вызначце від аднасастаўнага сказа *Дзіця не падманеш…*:**
1) пэўна-асабовы;
2) няпэўна-асабовы;
3) абагульнена-асабовы;
4) безасабовы;
5) інфінітыўны.

**2 Адзначце аднасастаўныя намінатыўныя сказы:**
1) Зіма.
2) Дарога звонкая, як сталь.
3) Лясная дарога.
4) Над палямі туман.
5) Раніца ў вёсцы.

**3 Адзначце аднасастаўныя пэўна-асабовыя сказы:**
1) Іду дарогаю лясною.
2) Шлю падзяку вёскам і сябрам.
3) Людзей слухай, а свой розум май.
4) Сёння сустрэла любімых сяброў.
5) Напевы дзіўныя збіраю ў жытнім полі і бары.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**4 Адзначце аднасастаўныя няпэўна-асабовыя сказы:**
1) Ад дабра дабра не шукаюць.
2) Дэлегацыю сустракалі ўрачыста.
3) Вечарам мяне пазвалі на сход.
4) У дзверы пакоя нясмела пастукалі.
5) Шукала цябе ўсё жыццё.

**5 Адзначце аднасастаўныя безасабовыя сказы:**
1) Дарогу засыпала залатое лісце.
2) Пахне канюшынай, падасінавікамі і рознымі палявымі кветкамі.
3) Прыемна ў дом зайсці з дарогі.
4) Нікому нас не знішчыць, не спыніць.
5) Так бы сядзець, маўчаць і глядзець на зачараваны азёрны прастор.

# ПРОСТЫ ЎСКЛАДНЕНЫ СКАЗ

## Варыянт 1

**1 Вызначце, чым ускладнены сказ *Дзіця павінна навучыцца не толькі гаварыць, але і слухаць*:**
1) звароткам;
2) аднароднымі членамі;
3) адасобленым азначэннем;
4) адасобленай акалічнасцю;
5) удакладненнем.

**2 Адзначце сказы, якія з'яўляюцца ўскладненымі:**
1) На стале сіпіць і сіпіць роўным бляклым святлом сваім лямпа.
2) Спаў ён на шырокай непафарбаванай лаўцы.
3) Люблю свой край, зялёны і спакойны.
4) Не бойся, дружа, бур і цішыні.
5) У пярэднім пакоі жанчыны – маці з Зосяй – ляскалі посудам.

**3 Адзначце сказы, ускладненыя адасобленымі азначэннямі. Улічыце, што знакі прыпынку не расстаўлены:**
1) Так смеючыся і жартуючы ўсе разам выйшлі ў калідор.
2) Як непадобны старажытны Мінск на сучасную сталіцу Беларусі вялікую і прыгожую!
3) Саломку выгнуўшы дугою звісае колас над зямлёю.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

4) Забалочаная паляна акружаная з усіх бакоў цёмнаю сцяною лесу млела ад гарачыні.
5) Ва ўсіх казках складзеных у школе Сухамлінскага б'ецца яго сэрца жыве яго душа.

**4 Адзначце сказы, ускладненыя адасобленымі акалічнасцямі. Улічыце, што знакі прыпынку не расстаўлены:**
1) За адчыненыя вароты пахістваючыся выйшаў дзябёлы цёмнабароды мужчына.
2) У вядзёрку запраўленая перцам і лаўровым лістом даходзіла юшка.
3) Добрай раніцы сонечны лес!
4) Ён нечага ўсміхнуўся ў свае густыя сіваватыя вусы дастаючы з кошыка міскі хлеб лыжкі.
5) Раптам з боку вёскі пачуўся стрэл.

**5 Адзначце сказы, ускладненыя пабочнымі канструкцыямі. Улічыце, што знакі прыпынку не расстаўлены:**
1) Велічэзная бяроза ўзнімалася і над дарогай і здавалася над усім лесам.
2) Сёння яна здавалася ўпэўненай.
3) Вёску відаць здалёк.
4) Мабыць жанчыны ішлі дадому.
5) У мяне нават і ноты ёсць.

## Варыянт 2

**1 Вызначце, чым ускладнены сказ *Народ пранясе цябе, родная мова, святлом незгасальным у сэрцы сваім*:**
1) звароткам;
2) аднароднымі членамі;
3) адасобленым азначэннем;
4) адасобленай акалічнасцю;
5) удакладненнем.

**2 Адзначце сказы, якія з'яўляюцца ўскладненымі:**
1) Усё жыло, здавалася, чаканнем снегу.
2) Яна здавалася стомленай.
3) Мядовы пах чабору змешваецца з густым настоем нагрэтай сонцам зямлі.
4) Дзень быў ясны, блакітны.
5) Невысокія стройныя сосны ўперамешку з кучаравымі елкамі паўкругам абдымалі поле.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**3 Адзначце сказы, ускладненыя адасобленымі азначэннямі. Улічыце, што знакі прыпынку не расстаўлены:**
1) Паабапал дарогі было поле жоўтае ад іржышча.
2) Яны не змаўляючыся пабеглі на голас.
3) На дол яшчэ па-вераснёўску цёплы хай сцеле восень туманоў сувой...
4) Сярэдняга росту шырокі і прысадзісты ён усім сваім выглядам сведчыў аб дэмакратычнасці свайго паходжання.
5) Тут жа стаялі неахайна заваленыя кнігамі шафа тэлевізар канапа.

**4 Адзначце сказы, ускладненыя адасобленымі акалічнасцямі. Улічыце, што знакі прыпынку не расстаўлены:**
1) Трактар дайшоў да канца палетка і завярнуўшыся заняў новыя барозны.
2) Старэйшы сын жыў ужо аддзяліўшыся.
3) Маладая кабыла хоць і накрытая дзяругай капрызна танцуе ў аглоблях ад аваднёў.
4) Пацяжэлі і паплылі пераварочваючыся і дыхаючы холадам снегавыя хмары.
5) Ён відаць не прыйдзе.

**5 Адзначце сказы, ускладненыя пабочнымі канструкцыямі. Улічыце, што знакі прыпынку не расстаўлены:**
1) Дзесьці з-пад Слуцка а можа з-пад Любані нехта ідзе.
2) Мабыць жанчыны ішлі дадому.
3) Адсюль добра відаць лес.
4) Аказваецца брат прывёў да нас зусім незвычайнага госця.
5) Кацярына паабяцала прыйсці аднак не прыйшла.

## Варыянт 3

**1 Вызначце, чым ускладнены сказ *Там, угары над галавою, ідуць вагоны чарадою!..*:**
1) звароткам;
2) аднароднымі членамі;
3) адасобленым азначэннем;
4) адасобленай акалічнасцю;
5) удакладненнем.

**2 Адзначце сказы, якія з'яўляюцца ўскладненымі:**
1) Увесь беларускі народ узняўся на справядлівую ўсенародную барацьбу супраць ненавіснага ворага.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

2) Стары каваль, па прозвішчу Дубовік, гартаваў сякеру.
3) Мы ў нашы мары, як у праўду, верым.
4) Нідзе ні гуку, ні руху, ні ветрыку.
5) Дальнія хвойнікі былі зацягнуты шызай смугой.

**3 Адзначце сказы, ускладненыя адасобленымі азначэннямі. Улічыце, што знакі прыпынку не расстаўлены:**
1) Кучаравілася шыпшына расшытая аранжавымі ягадамі.
2) Крынічка спакойная на паверхні выкідала з глыбіні сваёй пясчаныя фантанчыкі.
3) Дарога крута падымалася ўгору праз жоўты сыпучы пясок.
4) Увесь дзень за выключэннем перапынку на абед і снеданне быў прызначаны агляду калгаснай гаспадаркі.
5) Зноў настала вясна дружная цёплая з дажджамі і навальніцамі.

**4 Адзначце сказы, ускладненыя адасобленымі акалічнасцямі. Улічыце, што знакі прыпынку не расстаўлены:**
1) Вакол ападаючы шамацела лісце...
2) Ціха шалясцяць на ветрыку пахучыя ліпы скідаючы на жвір на траву цяжкія кроплі расы.
3) Дарога выйшла на край узгорка адкрыўшы перад намі новыя краявіды.
4) Акрамя рыбы ў рэчцы было багата ракаў.
5) Дзень добры вам лясы і далі!

**5 Адзначце сказы, ускладненыя пабочнымі канструкцыямі. Улічыце, што знакі прыпынку не расстаўлены:**
1) Навечна будзь благаслаўлёны запрацаваны ў поце хлеб!
2) Садок быў праўда невялічкі.
3) Праўда даражэй за грошы.
4) Тут здавалася ўсё жыло толькі зменай дзён і начэй.
5) Вядома яблык ад яблыні далёка не ўпадзе.

## Варыянт 4

**1 Вызначце, чым ускладнены сказ *І ўсё гэта, мякка кажучы, не адпавядае ісціне*:**
1) звароткам;
2) аднароднымі членамі;
3) адасобленым азначэннем;
4) адасобленай акалічнасцю;
5) пабочнай канструкцыяй.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**2 Адзначце сказы, якія з'яўляюцца ўскладненымі:**
1) Дзьмуў нямоцны, але пякучы вецер.
2) Сэнс гэтых простых слоў я зразумеў значна пазней.
3) Рыгор Андрэевіч Угоднік (такое было яго прозвішча) ляжаў на цвёрдым ложку.
4) Нам трэба было стаяць не дыхаючы.
5) Чытайце казкі, хлопцы і дзяўчаты!

**3 Адзначце сказы, ускладненыя адасобленымі азначэннямі. Улічыце, што знакі прыпынку не расстаўлены:**
1) З выгляду спакойны і стрыманы Даніла Мікалаевіч у душы хваляваўся не менш за маёра.
2) За паваротам машына спынілася перад ярка асветленай хатай з верандай.
3) Усё навокал жыло і варушылася сагрэтае цяплом веснавога дня.
4) Рака спакойная ўчора ўночы выйшла з берагоў.
5) Сцёпка ўжо стаяў перад вялікім кастром добра складзеных смалістых карчоў.

**4 Адзначце сказы, ускладненыя адасобленымі акалічнасцямі. Улічыце, што знакі прыпынку не расстаўлены:**
1) Не хваліся нажаўшыся а хваліся змалаціўшы.
2) Я вярнуўся ў пакой і не запальваючы свечкі сеў на ложак.
3) Усю ноч бушавала вада ўсё больш і больш падмываючы берагі расшыраючы сваё рэчышча.
4) Куды гэта вы выбраліся на ноч гледзячы?
5) На жаль дарога была кепская ў выбоінах.

**5 Адзначце сказы, ускладненыя пабочнымі канструкцыямі. Улічыце, што знакі прыпынку не расстаўлены:**
1) Неўзабаве прыйшлі бацькі.
2) Мы адной табе належым Беларусь мая.
3) Сарамлівасць на маю думку сведчыць пра сціпласць.
4) Шчасце напэўна прыходзіць нечакана.
5) Зусім не па сваёй волі і не дзякуючы сваім заслугам іх яшчэ не было стаў малодшы Ягайлаў сын Казімір вялікім князем літоўскім.

# Варыянт 5

**1 Вызначце, чым ускладнены сказ *Але паўсюль – і толькі гэта рабіла лягчэйшай справу маю – я сустракаў увагу і далікатнасць*:**

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

1) аднароднымі членамі;
2) адасобленым азначэннем;
3) адасобленай акалічнасцю;
4) пабочнай канструкцыяй;
5) устаўной канструкцыяй.

**2 Адзначце сказы, якія з'яўляюцца ўскладненымі:**
1) Парыжэлая на сонцы атава ніяк не сохла.
2) У хаце, апрача бабкі Насты, нікога не было.
3) Спявалі жаваранак і шпак.
4) Узнёслы Міцеў настрой як рукой зняло.
5) Цемра – хоць вока выкалі.

**3 Адзначце сказы, ускладненыя адасобленымі азначэннямі. Улічыце, што знакі прыпынку не расстаўлены:**
1) У мяне з'яўляецца адна думка падаць у гэтую камісію свае запіскі і лісты.
2) Так смеючыся і жартуючы яны ўсе разам выйшлі ў калідор а потым на двор.
3) Пятым ад канца вуліцы стаяў стары дом.
4) Часта сню я азёры Палесся і дубровы сінія ад рос.
5) Сабраныя ў кошык антонаўкі смачна пахлі.

**4 Адзначце сказы, ускладненыя адасобленымі акалічнасцямі. Улічыце, што знакі прыпынку не расстаўлены:**
1) Чалавек паглыбляўся ў гушчар ступаючы размерана ўгадваючы небяспеку.
2) За выключэннем камандзіра ніхто нічога не заўважыў.
3) Седзячы на вогненнай калясніцы Пярун раз'язджае па небе.
4) Вецер нібы знарок пазганяў хмары з неба.
5) Марыся прысела надзьмуўшыся.

**5 Адзначце сказы, ускладненыя пабочнымі канструкцыямі. Улічыце, што знакі прыпынку не расстаўлены:**
1) Малюнкі родныя і з'явы як вы мне любы і цікавы!
2) Дзед запрагае каня кідае на калёсы граблі вілы касу аднак нясе на плячы.
3) Паветра здавалася трымцела ад мроіва.
4) Дыханне здавалася цяжкім.
5) Як расказвала маці ён быў маўчуном і адзінотнікам.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# АДКАЗЫ

**Словазлучэнне**

| № задання | Вар. 1 | Вар. 2 | Вар. 3 | Вар. 4 | Вар. 5 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 1, 3, 5 | 2, 3, 5 | 3, 5 | 1, 3, 4, 5 | 1, 3, 5 |
| 2 | 1, 3, 4 | 4, 5 | 2, 3, 4 | 4, 5 | 1, 3, 4 |
| 3 | 2, 3, 4 | 3, 4 | 3, 4 | 2, 3, 4 | 1, 2, 4 |
| 4 | 1, 2, 3 | 1, 3, 4 | 1, 3, 4, 5 | 1, 2, 4 | 1, 2, 3 |
| 5 | 1, 4, 5 | 1, 5 | 1, 5 | 1, 3, 4 | 1, 2 |

**Просты сказ. Агульная характарыстыка простага сказа**

| № задання | Вар. 1 | Вар. 2 | Вар. 3 | Вар. 4 | Вар. 5 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 1, 4, 5 | 2, 4 | 2, 4, 5 | 1, 4, 5 | 1, 4 |
| 2 | 1, 2, 5 | 2, 3 | 2, 4, 5 | 1, 3, 4 | 2, 3, 4 |
| 3 | 1, 3, 5 | 1, 2 | 1, 3, 4 | 5 | 3, 5 |
| 4 | 4 | 5 | 3 | 2, 3, 5 | 3, 4, 5 |
| 5 | 3, 5 | 2, 4, 5 | 1, 2, 4 | 1, 3, 4 | 1, 3, 4 |

**Дзейнік**

| № задання | Вар. 1 | Вар. 2 | Вар. 3 | Вар. 4 | Вар. 5 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 3, 4 | 2, 3, 5 | 3, 4, 5 | 2, 3, 5 | 1, 3, 5 |
| 2 | 1, 2, 4 | 1, 2, 5 | 2, 3, 5 | 3, 4, 5 | 3, 5 |
| 3 | 3 | 1, 3 | 3, 5 | 3, 5 | 1, 2 |
| 4 | 3, 5 | 2, 3, 4 | 2, 4 | 3, 4 | 3, 4 |
| 5 | 1, 3, 4 | 2, 3, 4 | 4 | 3 | 1, 3 |

**Выказнік**

| № задання | Вар. 1 | Вар. 2 | Вар. 3 | Вар. 4 | Вар. 5 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 1, 3, 4 | 1, 2, 4 | 1, 2, 3 | 1, 2, 3 | 2, 4. 5 |
| 2 | 3, 5 | 3, 4 | 3, 4 | 3 | 5 |
| 3 | 1, 2, 3 | 1, 2, 5 | 2, 3, 4 | 2, 3, 4 | 1, 2, 3, 4 |
| 4 | 2, 4 | 2, 5 | 2, 3 | 2, 3 | 1, 5 |
| 5 | 2, 3, 4 | 2, 4 | 1, 4, 5 | 4 | 5 |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**Даданыя члены сказа**

| № задання | Вар. 1 | Вар. 2 | Вар. 3 | Вар. 4 | Вар. 5 |
|---|---|---|---|---|---|
| **1** | 3, 4, 5 | 3, 4, 5 | 1, 4, 5 | 4, 5 | 2, 3, 5 |
| **2** | 3, 4 | 2, 3, 4 | 1, 2, 5 | 2, 4 | 2, 3, 4, 5 |
| **3** | 4, 5 | 2, 3, 4 | 2, 4 | 3, 4 | 2, 3, 5 |
| **4** | 2, 3, 4 | 1, 4, 5 | 1, 4 | 2, 3, 4 | 1, 3, 4 |
| **5** | 3, 4, 5 | 1, 2, 3 | 1, 2, 3, 4 | 1, 2, 3, 4 | 1, 2, 5 |

**Аднасастаўны сказ**

| № задання | Вар. 1 | Вар. 2 | Вар. 3 | Вар. 4 | Вар. 5 |
|---|---|---|---|---|---|
| **1** | 1 | 4 | 1 | 4 | 3 |
| **2** | 4, 5 | 2, 4, 5 | 2, 3, 5 | 3, 4, 5 | 1, 3 |
| **3** | 1, 5 | 2, 4, 5 | 2, 4 | 2, 3 | 1, 2, 5 |
| **4** | 1, 2 | 2, 3, 4 | 1, 2, 5 | 1, 3, 5 | 2, 3, 4 |
| **5** | 1, 3, 4 | 1, 3, 4 | 1, 2, 3 | 1, 4 | 2, 3 |

**Просты ўскладнены сказ**

| № задання | Вар. 1 | Вар. 2 | Вар. 3 | Вар. 4 | Вар. 5 |
|---|---|---|---|---|---|
| **1** | 2 | 1 | 5 | 5 | 1, 5 |
| **2** | 3, 4, 5 | 1, 4 | 2, 3, 4 | 1, 3, 5 | 2, 3 |
| **3** | 2, 4, 5 | 1, 3, 4 | 1, 2, 5 | 1, 3, 4 | 1, 4 |
| **4** | 1, 4 | 1, 4 | 1, 2, 3 | 2, 3 | 1, 3 |
| **5** | 1, 4 | 1, 2, 4 | 2, 4, 5 | 3, 4 | 2, 3, 5 |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# ЛІТАРАТУРА

1 Абабурка, М. В. Параўнальная граматыка беларускай і рускай моў / М. В. Абабурка. – Мн., 1992. – 324 с.

2 Арутюнова, Н. Д. Предложение и его смысл / Н. Д. Арутюнова. – М.: Наука, 1976. – 383 с.

3 Бабайцева, В. В. Система членов предложения в современном русском языке: учебное пособие для студентов пед. ин-тов по спец. № 2101 «Рус. яз. и лит.» / В. В. Бабайцева. – М.: Просвещение, 1989. – 159 с.

4 Беларуская мова: Сінтаксіс. Пунктуацыя : вучэб. дапаможнік для студэнтаў фак. педагогікі і методыкі пачатк. навучання / Я. М. Адамовіч [і інш.]; пад рэд. Я. М. Адамовіча. – Мн.: Выш. шк., 1989. – 303 с.

5 Беларуская мова: падручнік: у 2 ч. Ч. 2. Сінтаксіс / Я. М. Адамовіч [і інш.]; пад рэд. Л. М. Грыгор’евай. – 4-е выд. – Мн.: Выш. шк., 2004. – 222 с.

6 Бурак, Л. І. Сучасная беларуская мова: Сінтаксіс. Пунктуацыя: вучэб. дап. для філалаг. фак. ун-таў / Л. І. Бурак. – Мн.: Універсітэцкае, 1987. – 320 с.

7 Граматыка беларускай мовы / рэд. М. В. Бірыла, П. П. Шуба : у 2 т. Т. 2. Сінтаксіс. – Мн., 1966. – 466 с.

8 Золотова, Г. А. Коммуникативные аспекты русского синтаксиса / Г. А. Золотова. – М.: Наука, 1982. – 368 с.

9 Золотова, Г. А. Синтаксический словарь. Репертуар элементарных единиц русского синтаксиса / Г. А. Золотова. – М.: Наука, 1988. – 440 с.

10 Краткий справочник по современному русскому языку / Л. Л. Касаткин [и др.]; под ред. П. А. Леканта. – М.: Высш. школа, 1991. – 383 с.

11 Кодухов, В. И. О двух основных аспектах предложения / В. И. Кодухов // Теоретические проблемы синтаксиса современных индоевропейских языков / редкол.: В. Г. Адмони (отв. ред.) [и др.]. – М.: Наука, 1975. – С. 33–40.

12 Лепешаў, І. Я. Практыкум па беларускай мове: вучэб. дапам. / І. Я. Лепешаў, Г. М. Малажай, К. М. Панюціч. – Мн.: Універсітэцкае, 2001. – 320 с.

13 Лингвистический энциклопедический словарь / гл. ред. В. Н. Ярцева. – М.: Сов. энциклопедия, 1990. – 685 с.

14 Ломтев, Т. П. Структура предложения в современном русском языке / Т. П. Ломтев; под ред. Н. Д. Арутюновой. – М.: МГУ, 1979. – 198 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

15 Малажай, Г. М. Зваротак / Г. М. Малажай // Беларуская мова: Энцыкл. / пад рэд. А. Я. Міхневіча. – Мн., 1994. – С. 38–41.

16 Малажай, Г. М. Устаўныя канструкцыі / Г. М. Малажай // Беларуская мова: Энцыкл. / пад рэд. А. Я. Міхневіча. – Мн., 1994. – С. 354–356.

17 Михневич, А. Е. Проблемы семантико-синтаксического исследования белорусского языка: Автореф. дис. … д-ра филолог. наук: 10. 02. 01 / А. Е. Михневич. – Мн., 1976. – 44 с.

18 Міхневіч, А. Я. Праблемы семантыка-сінтаксічнага даследавання беларускай мовы / А. Я. Міхневіч; рэд. В. У. Мартынаў. – Мн.: Навука і тэхніка, 1976. – 264 с.

19 Міхневіч, А. Я. Словазлучэнне / А. Я. Міхневіч // Беларуская мова: Энцыкл. / пад рэд. А. Я. Міхневіча. – Мн., 1994. – С. 280–283.

20 Москальская, О. И. Проблемы системного описания синтаксиса (на материале немецкого языка): учебное пособие / О. И. Москальская. – 2-е изд., перераб. и доп. – М.: Высш. школа, 1981. – 175 с.

21 Наркевіч, А. І. Сістэма словазлучэнняў у сучаснай беларускай мове: Структурна-семантычнае апісанне / А. І. Наркевіч. – Мн., 1972. – 236 с.

22 Норман, Б. Ю. Универсальное и специфическое в синтаксических моделях славянских языков: X Междунар. съезд славистов. Доклады / Б. Ю. Норман. – Мн.: Университетское, 1988. – 28 с.

23 Падгайскі, Л. П. Словазлучэнне ў беларускай мове: Дзеяслоўна-іменныя словазлучэнні з акалічнаснымі адносінамі / Л. П. Падгайскі. – Мн., 1971.

24 Пешковский, А. М. Русский синтаксис в научном освещении / А. М. Пешковский. – 7-е изд. – М.: Учпедгиз, 1956. – 512 с.

25 Рагаўцоў, В. І. Сінтаксіс беларускай і рускай моў: Дыскусійныя пытанні: дапам. / В. І. Рагаўцоў. – Мн.: Універсітэцкае, 2001. – 199 с.

26 Сіўковіч, В. М. Беларуская мова ў пытаннях і адказах: дапаможнік для вучняў старэйшых класаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай і рускай мовамі навучання / В. М. Сіўковіч. – 4-е выд. – Мн.: УніверсалПрэс, 2007. – 592 с.

27 Современный русский язык: учебник / под ред. В. А. Белошапковой. – М.: Высш. школа, 1981. – 560 с.

28 Сулейманова, О. А. Проблемы русского синтаксиса / О. А. Сулейманова. – М: Наука, 1999. – 148 с.

29 Сусов, И. П. Предложение как объект лингвистической семантики / И. П. Сусов // Проблемы синтаксической семантики: материалы науч. конф.– М., 1976. – С. 244–245.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

30 Сучасная беларуская мова: вучэб. дапам. / Л. М. Грыгор’ева [і інш.]; пад агул. рэд. Л. М. Грыгор’евай. – Мн.: Выш. шк., 2006. – 559 с.

31 Цыбульская, С. І. Даведнік па арфаграфіі і пунктуацыі беларускай мовы / С. І. Цыбульская, І. У. Каліцэня. – 2-е выд. – Мн.: ТетраСистемс, 2006. – 272 с.

32 Шахматов, А. А. Синтаксис русского языка / А. А. Шахматов.– 2-е изд. – Л.: Гос. учебно-пед. изд-во наркомироса РСФСР, Ленинградское отд-ние, 1941. – 620 с.

33 Яўневіч, М. С. Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы: падруч. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей устаноў, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі / М. С. Яўневіч, П. У. Сцяцко. – Мн.: Аверсэв, 2006. – 286 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*Вучэбнае выданне*

**Бобрык** Уладзімір Андрэевіч;
**Цімашэнка** Наталля Паўлаўна

# СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ МОВА:
# СІНТАКСІС

Тэставыя заданні

для студэнтаў
спецыяльнасці 1-21 05 01 «Беларуская філалогія» (па напрамках)

*Рэдактар В. І. Шкрэдава*
*Карэктар В. У. Калугіна*

Падпісана ў друк 18.03.2015. Фармат 60×84 1/16.
Папера афсетная. Рызаграфія. Умоўн. др. арк. 2,8.
Улік.-выд. арк. 3,1. Тыраж 25 экз. Заказ 180.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
“Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Францыска Скарыны”.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вырабніка,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/87 ад 18.11.2013.
Спецыяльны дазвол (ліцэнзія) № 02330 / 450 ад 18.12.2013.
Вул. Савецкая, 104, 246019, Гомель.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У. А. БОБРЫК, Н. П. ЦІМАШЭНКА

# СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ МОВА:
# СІНТАКСІС

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Гомель
2015